ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова Праўлення
Нацыянальнага банка
Рэспублікі Беларусь
27.09.2011 № 396
(с учетом изменений, внесенных постановлением Правления Национального банка 17.12.2019 № 504)

ПАЛАЖЭННЕ

аб Падзячным пісьме
Старшыні Праўлення
Нацыянальнага банка
Рэспублікі Беларусь

1. Дадзеным Палажэннем устанаўліваюцца парадак і ўмовы ўручэння Падзячнага пісьма Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь (далей – Падзячнае пісьмо).

2. Падзячнае пісьмо ўручаецца работнікам Нацыянальнага банка, іншым грамадзянам Рэспублікі Беларусь, калектывам іншых арганізацый за дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў, выкананне найбольш важных работ і даручэнняў, актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў з удзелам Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка або яго намеснікаў.

(Пункт 2 с учетом изменений, внесенных постановлением Правления Национального банка от 17.12.2019 № 504)

3. Падзячнае пісьмо ўручаецца па ініцыятыве Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка, па прапановах намеснікаў Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка, кіраўнікоў структурных падраздзяленняў цэнтральнага апарату і структурных падраздзяленняў Нацыянальнага банка.

(Пункт 3 с учетом изменений, внесенных постановлением Правления Национального банка от 17.12.2019 № 504)

4. Прадстаўленне да ўручэння Падзячнага пісьма павінна змяшчаць звесткі аб грамадзяніне Рэспублікі Беларусь або калектыве арганізацыі згодна з дадаткамі 1 і 2. У прадстаўленні таксама ўказваюцца заслугі, за якія прадстаўляюцца да ўручэння Падзячнага пісьма.

(Пункт 4 с учетом изменений, внесенных постановлением Правления Национального банка от 17.12.2019 № 504)

5. Рашэнне аб уручэнні Падзячнага пісьма прымаецца Старшынёй Праўлення Нацыянальнага банка і афармляецца загадам.

(Пункт 5 в редакции постановления Правления Национального банка от 17.12.2019 № 504)

6. Спецыяльныя лісты Падзячнага пісьма ўручаюцца работнікам Нацыянальнага банка, іншым грамадзянам Рэспублікі Беларусь, калектывам іншых арганізацый Старшынёй Праўлення Нацыянальнага банка ці па яго даручэнні службовымі асобамі на падставе загада Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка ва ўрачыстай абстаноўцы.

(Пункт 6 с учетом изменений, внесенных постановлением Правления Национального банка от 17.12.2019 № 504)

Дадатак 1
да Палажэння аб Падзячным пісьме Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь
(в редакции постановления Правления Национального банка 17.12.2019 № 504)

ПРАДСТАЎЛЕННЕ
да ўручэння Падзячнага пісьма Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь

1. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку ______________________________

2. Число, месяц і год нараджэння ______________________________

3. Пасада, месца працы (службы) ______________________________

4. Грамадзянства ______________________________

5. Агульны стаж работы (службы) ______________________________

   Стаж работы ў Нацыянальным банку ______________________________

6. Характарыстыка з указаннем заслуг, за якія прадстаўляецца да ўручэння Падзячнага пісьма Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________ ______________ ______________________
(пасада) (подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

”___“_________20__ г.